4) наладжаньне фінансаў і прадавольства і арганізацыя помачы ваеннапалонным; паварот да хат бежанцаў;

5) падгатоўка адбудовы эканамічнага жыцьця.

У *справе зямельнай:*

Толькі народ у сваім цэлым ёсьць праўдзівы гаспадар усяго прыроднага багацьця краю і ўсіх зямельных абшараў. Толькі ён праз свае дзяржаўныя ўстановы мае права распарадку зямлёй, выдаючы адпаведныя законы.

Апіраючыся на гэтых прынцыпах, габінэт будзе праводзіць:

1) прызнаньне лясных масіваў і нетраў зямлі нацыянальным меньнем; забарона продажы лясоў;

2) правядзеньне зямельнага сьпісу; устанаўленьне minimum'а разьмераў сялянскіх гаспадарак[3] і maximum'а зямельнай уласнасьці;

3) утварэньне нацыянальнага зямельнага фонду дзеля надзелу малазямельных і безьзямельных земляробаў;

4) устанаўленьне зямельнай палітыкі на аснове рацыяналізацыі дробных сялянскіх гаспадарак;

5) абарона нацыянальнага зямельнага багацьця і ладу на зямлі.

У *справе работніцкай:* падгатоўка і правядзеньне работніцкага правадаўства ў мысьль сац.–дэм. праграмы.

У *справе нацыянальнай:*

1) забесьпячэньне беларускаму народу фактычнай магчымасьці культурна–нацыянальнага разьвіцьця;

2) свабода для ўсіх нацыянальнасьцей і раўнапраўства, забясьпечаныя за [...]

## Пратэст Рады Народных Міністраў

Дэкрэтам аб выбарах да Ўстаноўчага Сойму Польшчы з 28 лістапада сёл. г. за подпісамі Начальніка Дзяржавы, Прэзыдэнта Міністраў і Міністра Ўнутраных Спраў расьпісаны выбары, паміж іншым, і на землі як этнаграфічна, так і гістарычна Беларускія: Беласточчыну і Бельшчыну.

Гэты акт Польскага Ўраду, праціўны праву ўсіх народаў на самаазначэньне, раўназначны анэксіі Польшчай інтэгральнай часьці Беларусі, не абапёрты ні на этнаграфіі, ні на гістарычным праве, ні на волі народных мас, вызывае самае глыбокае абурэньне ўсяго Беларускага Народу як нарушэньне яго сувэрэнных правоў.

Не прэтэндуючы на тыя заходнія воласьці Бельскага павету, дзе жыве этнаграфічна польскае насяленьне, Рада Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі выказвае проці спробы анэксіі часьці чыста Беларускай тэрыторыі з глаўным прамышленым цэнтрам Беларусі, Беластокам, свой самы гарачы пратэст і папярэджвае Ўрад Польскай Рэчыпаспалітай, што захаваньне ў сіле памянутага дэкрэту ў часьці, датыкаючай Беласточчыны і Бельшчыны, яна будзе ўважаць за варожае проці Беларускай Народнай Рэспублікі выступленьне, адказ за пасьледзтвы каторага ў сфэры беларуска–польскіх адносін ускладае на польскі Ўрад.

## Штрэйкбрэхеры

У часе, калі на арэну грамадзкага жыцьця выступаюць народныя масы, побач з найлепшымі парывамі чалавечай душы выяўляюцца самыя нізкія, самыя паганыя староны чалавечай душы.